# НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

## XX МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ “БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ” У МДЛУ

2 красавіка 2021 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму і цэнтрам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі праведзена XX міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць”, прысвечаная 20-годдзю Цэнтра беларускай мовы і культуры. У канферэнцыі прынялі ўдзел 45 даследчыкаў, у тым ліку прадстаўнікі розных навуковых, вучэбных, архіўных і музейных устаноў Беларусі (Брэст, Гомель, Мінск, Магілёў, Полацк), а таксама навукоўцы з Германіі (Берлін, Дрэздэн, Ляйпцыг) і Расіі (Архангельск, Арэнбург, Санкт-Пецярбург).

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў канферэнцыі ў сувязі з яе юбілейнай датай звярнуліся: сустаршыня аргкамітэта канферэнцыі, прарэктар па навуковай рабоце доктар філалагічных навук Л. А. Тарасевіч, прафесар кафедры педагогікі МДЛУ кандыдат філалагічных навук Н. П. Баранава, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі доктар гістарычных навук прафесар А. А. Каваленя, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдат гістарычных навук В. Л. Лакіза, намеснік дырэктара па знешніх і грамадскіх сувязях Санкт-Пецярбургскага Інстытута гісторыі РАН, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі доктар гістарычных навук прафесар Ю. З. Кантар, навуковы дырэктар ваенна-гістарычнага музея Бундэсвера ў Дрэздэне доктар гісторыі К. Янеке, галоўны навуковы спецыяліст Музея Другой сусветнай вайны ў Гданьску доктар гісторыі Д. Панцьё, дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь А. К. Дземянюк.

Праца канферэнцыі ладзілася ў фармаце трох пленарных пасяджэнняў: 1. 80-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны: дакументальны нарматыў і даследчыцкія падыходы (вядучыя У. К. Коршук, А. М. Літвін). 2. Вялікая Айчынная вайна: падзеі – факты – людзі (вядучыя У. В. Здановіч, Я. А. Грэбень). 3. Беларусь і Германія: вякі гісторыі і дзесяцігоддзе супрацоўніцтва (вядучыя А. М. Кушнярэвіч, П. А. Канцавы). Апроч таго, была зладжана прэзентацыя двух новых выданняў і праведзена ўшанаванне памяці пра С. П. Кубеку.

У ходзе першага пасяджэння “80-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны: дакументальны нарматыў і даследчыцкія падыходы” былі заслуханы навуковыя даклады даследчыкаў, у тым ліку: Т. С. Сюзюмавай (МДЛУ), С. Я. Новікава (МДЛУ), У. К. Коршука (Мінск), К. Ганцара (Ляйпцыг), Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург), А. М. Літвіна (Мінск).

Вядучы бібліятэкар бібліятэкі МДЛУ Т. С. Сюзюмава распавяла з нагоды 20-гадовага юбілею аб Цэнтры беларускай мовы і культуры, пазнаёміла з яго багатым каталогам, у тым ліку з рэдкімі замежнымі выданнямі, пакінутымі аўтарамі ў якасці дарункаў, а таксама вызначыла асноўныя

вехі станаўлення гэтай структурнай адзінкі бібліятэкі ўніверсітэта. Сустаршыня аргкамітэту загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму С. Я. Новікаў падзяліўся з удзельнікамі чарговай сустрэчы вынікамі 20-гадовай працы беларускіх, нямецкіх, латышскіх, літоўскіх, расійскіх, польскіх даследчыкаў на ніве ваеннага беларусазнаўства, паказаў важнасць захавання навуковай пляцоўкі для правядзення новых сустрэч па ваеннай тэматыцы. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь доктар гістарычных навук прафесар У. К. Коршук падзяліўся з удзельнікамі канферэнцыі сваімі дзіцячымі ўспамінамі, якія трывала захоўвае памяць аб першых днях вайны ў сям'і Коршукаў. Нямецкі гісторык К. Гарцар прадставіў на канферэнцыі сваю новую манаграфію, якая выйшла на нямецкай мове ў Германіі і прысвечана 80-годдзю гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 года. Ю. З. Кантар нагадала ўдзельнікам канферэнцыі аб галоўных тэзісах, якія ўтрымлівае "Блакадная кніга" А. Адамовіча і Д. Граніна, і пра якія неабходна абавязкова памятаць у пачатку XXI стагоддзя. А. М. Літвін прадставіў пантэон памяці беларусаў, якія былі ўдзельнікамі савецка-фінляндскай вайны 1940 годзе.

З кароткімі паведамленнямі выступілі: магістр гуманітарных навук Патсдамскага ўніверсітэта Г. Поль "Малы Трасцянец у вымярэнні навуковага аналізу", загадчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна "Абарончыя баі Чырвонай арміі ў Беларусі летам 1941 года ў энцыклапедычных выданнях", прафесар кафедры ваеннай стратэгіі факультэта Генштаба Узброеных Сіл УА "Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь" "Скажэнне прычын пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў працах фальсіфікатараў гісторыі", старшы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі ІГ НАН Беларусі Д. Г. Кіенка "Разведзводкі і спецпаведамленні Заходняй асобай ваеннай акругі напярэдадні вайны (студзень–чэрвень 1941 г.)", загадчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта А. І. Корсак "Месцы масавага знішчэння насельніцтва на Віцебшчыне (1941–1944): да гісторыі пытання", дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму С. Р. Лютко "Супрацьпаветраная абарона Мінска ў чэрвені 1941 года", загадчыцы лабараторыі гісторыка-грамадазнаўчай і сацыяльна-культурнай адукацыі НМУ "Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь" А. М. Мох "Дзейнасць разведвальна-дыверсійнай спецгрупы «Стойкія» ў гады Вялікай Айчыннай вайны", загадчык кафедры Арэнбургскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Р. Р. Хісамутдзінава "Героі першых дзён", дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму А. Г. Цымбал "Калекцыя дакументаў генеральнай акругі «Беларусь» як крыніца па эканамічнай палітыцы акупацыйных улад (1941–1944)".

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады В. Д. Селяменева (Мінск), С. В. Кулінка (Мінск), А. А. Крыварота. Вядучы супрацоўнік аддзела публікацый НА РБ В. Д. Селяменеў распавёў удзельнікам канферэнцыі аб падрыхтоўцы Нацыянальным архівам шматтомнага выдання з серыі

“Без срока давности” аб злачынствах нямецкіх акупантаў і іх памагатых над мірным насельніцтвам Беларусі; загадчык аддзела публікацый НА РБ С. В. Кулінок спыніўся на выніках даследавання аб агентурнай рабоце нямецкіх спецслужбаў у 1939–1945 гг.; вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. А. Крыварот правеў параўнанне паміж даследаваннем беларускай партызанкі і польскім прасавецкім падполлем.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі, гістарыяграфічныя факты і даследчыцкія ацэнкі, ў тым ліку па асобных старонках гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час. Так, прагучалі паведамленні па наступнай тэматыцы: “Дакументы германскіх акупаыйын улад як біяграфічныя крыніцы” (Т. М. Агеенка), “На старонках нямецкіх справаздач: баявыя дзеянні атрада 121-й стралковай дывізіі ў тыле групы армій «Цэнтр» (ліпень – жнівень 1941 г.)” (У. К. Вазнясенскі), “Імёны на абеліску: баявыя дзеянні 16-й гвардзейскай бамбардзіровачнай авіяцыйнай дывізіі дальняга дзеяння з аэрадрома «Пружаны»” (В. Ю. Неліхаў), “Лідскі раён ў гады Вялікай Айчыннай вайны” (Г. С. Хадасевіч), “Д. Ц. Язаў: штрыхі да партрэта вядомага савецкага военачальніка” (М. В. Стралец, С. А. Пцічкіна), “Беларусы ў гістарычна-палітычнай думцы С. Віславуха)” (А. Г. Цымбал).

У ходзе трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы наступныя даклады. Прафесар кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму А. М. Кушнярэвіч выступіў з дакладам на тэму “Лютэранскія кірхі ў Беларусі”, дацэнт кафедры эканамічных навук МДЛУ І. С. Благуш прадставіла даклад “Інавацыйнае лідэрства індустрыяльнай эканомікі: «парадоксы» Германіі, выклікі для Беларусі”, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу БДУ І. А. Літвіноўскі і дацэнт кафедры гуманітарных навук БДУІР Ю. І. Літвіноўская пазнаёмілі з тэмай “Ля вытокаў савецка-германскага супрацоўніцтва”, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Магілёўскага дзяржаўнага абласнога інстытута развіцця адукацыі П. А. Канцавы пазнаёміў з вынікамі даследавання тэмы “Рэпарацыйныя пастаўкі ў БССР буйной рагатай жывёлы з Германіі (1945–1947)”.

З паведамленнямі выступілі А. У. Кузняцова-Ціманава “Нямецкая мова як пропуск ў Афрыку: аб удзеле выпускнікоў МДПІЗМ ў якасці ваенных перакладчыкаў у ваенных канфліктах (1950–1991)”; І. Д. Папоў “Канферэнцыі прам’ер-міністраў нямецкіх зямель як інстытут канстытуіравання заходняй Германіі (1946–1949)”; С. І. Бусько “Нямецкая мадэль гімнастыкі ў расійскай імперыі: ад прызнання да занядбання)”; М. М. Смальянінаў “Мінск і Мінская губерня у пачатковы перыяд Першай сусветнай вайны (ліпень 1914–кастрычнік 1915)”; В. В. Брыгадзіна “Жыццё і лёс адмірала А. У. Калчака: асноўныя напрамкі і вынікі даследавання)”.

У рамках трэцяга пасяджэння адбылася прэзентацыя дзвюх новых кніг: 1) “Мінскі магістрат і гарадская рада ў дакументах 1919–1920 гадоў” (прэзентацыя праведзена намеснікам дырэктара па ідэалагічнай, выхаваўчай

рабоце і сацыяльных пытаннях Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь А. Г. Дашкевіч і вядучым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. А. Скеп'ян); 2) "Напярэдадні–2" (прэзентацыя прадстаўлена старшым навуковым супрацоўнікам цэнтра ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кіраўніком навукова-даследчай групы вайсковай гісторыі і археалогіі Беларусі Д. Г. Кіенка).

У заключэнні пленарнага пасяджэння была ўшанавана памяць пра Сяргея Паўлавіча Кубеку (28.09.1954–23.11.2020): IN MEMORY.

Арганізатары канферэнцыі прадэманстравалі ўдзельнікам канферэнцыі слайдавую прэзентацыю, прысвечаную памяці С. П. Кубекі – сябра аргкамітэта штогадовай міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", аўтара шматлікіх выступленняў і апублікаваных у выдадзеных зборніках матэрыялаў. Прагучалі выступленні беларускіх гісторыкаў, калег і паплечнікаў С. П. Кубекі – С. Я. Новікава, Я. А. Грэбеня, А. М. Захарава, У. В. Здановіча, А. П. Заяц, А. М. Кушнярэвіча, А. Г. Цымбала, якія падзяліліся ўспамінамі пра свайго калегу, нагадалі вехі яго навуковай біяграфіі, прывялі шматлікія прыклады незабыўных сяброўскіх стасункаў, у тым ліку з замежнымі даследчыкамі – Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург), К. Зеліс (Рыга), К. Ганцар (Ляйпыг), Д. Панцьё (Гданьск),

У заключэнні былі падведзены вынікі канферэнцыі, удзельнікі якой адзначылі, што міжнароднае навуковае супрацоўніцтва з'яўляецца адметнай прыкметай сустрэч у МДЛУ. Добрай традыцыяй стала таксама рэгулярнае выданне зборніка матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

***Сяргей Новікаў,***
сустаршыня аргкамітэта канферэнцыі
кандыдат гістарычных навук

*Поступила в редакцию 24.03.2022*